# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 1 (50), 04 – 10.01.2007 г.


# НЕПАД'ЁМНЫ ГАЗ

## ЦІ ДАВЯДЗЕЦЦА БЕЛАРУСАМ ІСЦІ Ў ЗЯМЛЯНКІ?

Колькі ні пагражаў Лукашэнка "разрывам усіх дачыненняў", колькі ні енчылі чыноўнікі ніжэйшага рангу пра "саюзную дзяржаву" – усё адно "Газпром" узняў цану на газ болей чым у два разы. Перамовы па гэтым пытанні скончыліся за некалькі хвілін да Новага году.

Шмат гадоў Беларусь мела ад Расіі танныя энерганосьбіты. Гэта была добрая магчымасць, каб рэфармаваць эканоміку, пазбягаючы шокавых метадаў. Аднак улады РБ лічылі, што будуць атрымліваць газ і нафту па ўнутрырасійскіх коштах заўсёды. Узамен на абяцанкі стварыць чарговы "союз нерушимый". Толькі грошы ішлі не на рэформы, а марнаваліся на датацыі стратным прадпрыемствам і сельскай гаспадарцы.

Першы званок прагучаў напрыканцы 2003 году. Тады "Газпром" упершыню заявіў, што падвышае цану газа для Беларусі. Лукашэнка закаціў сапраўдную істэрыку, згадаў-

Працяг на стар.5



**Газакампрэсарная станцыя** *на трубаправодзе Ямал-Еўропа. Нясвіжскі раён, студзень 2006 году.*

## ЯКУЮ СВІННЮ ПАДКІНЕ 2007 ГОД?

### ПЫТАННЕ ТЫДНЯ

► СТАР. 2

## САЛА, БУЛЬБА, ЛУКАШЭНКА

### ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ Ў ВАЧАХ СУСЕДЗЯЎ

► СТАР. 4

# ЯКУЮ СВІННЮ, НА ВАШУ ДУМКУ, МОЖА ПАДКІНУЦЬ БЕЛАРУСІ 2007 ГОД?

**АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ПАЛІТЫК:**

## “УЛАДАМ – САПРАЎДНУЮ”

Я думаю, што гэты год падкіне ўладзе сапраўдную свінню. Народу – добрую. Свінню, якая зменіць сітуацыю карэнным чынам.

**ВОЛЬГА, ЭКАНАМІСТКА:**

## “СВІННЯ БУДЗЕ СКВАПНАЯ ДА НАШЫХ ГРОШАЙ”

Баюся, што свіння будзе вельмі сквапная да беларускіх грошай. Яна можа з’есці шмат якія ўклады. Бо курс можа пахіснуцца. А як пойдзе недавер да нашага рубля, дык пойдзе такая ланцуговая рэакцыя, што 90-я гады пададуцца казкай. Так што, купляйце гіпсавыя капілкі-свінкі. Могуць спатрэбіцца.

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ, ПАЭТ:**

## “БУДЗЕ ПАЗІТЫЎНАЯ СВІННЯ”

У наступным годзе ў Беларусі адбудуцца радыкальныя пазітыўныя змены. Большасць маіх знаёмых будзе перажываць велізарны крызіс. Большасць знаёмых літаратараў не будзе ведаць, на якую халеру ім займацца далей літаратурай. Бо не будуць мець персоны для крытыкі. Яны адразу зразумеюць, што яны банальныя графаманы. Большасць нашых знаёмых палітыкаў, апазіцыянераў таксама зразумеюць, што яны нічога не ўмеюць. Бо ім давядзецца браць уладу ў свае рукі, і выйдзе на паверхню іхняя некампетэнтнасць. Нашы мастацтвазнаўцы – з тых, якія гоняць на тых, хто разбурае Мінск, раптам атрымаюць карт-бланш: зрабіце горад такім прыгожым, якім хацелася б, адбудуйце, што трэба адбудоўваць. І таксама нясоладка ім давядзецца. І гэтак далей. Вось такая будзе пазітыўная свіння.

**АЛЕСЬ, ФІНАНСАВЫ РАБОТНІК:**

## “УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, УСЁ Ў НАС ПРАЦУЕ”

Самая галоўная свіння – гэта парадаксальная сітуацыя, у якую трапіла наша кіраўніцтва. Мясцовыя эліты яго проста ненавідзяць і не падтрымліваюць. І ўжо скончаная і пахаваная саюзная дамова. Гэта вельмі складаная сітуацыя, калі няма ўнутранай падтрымкі і знешняй. А з эканамічным становішчам усё будзе добра, усё ў нас працуе. Людзі мы дысцыплінаваныя, сціплыя, прывыклі да беднасці.

**РЫГОР СІТНІЦА, МАСТАК:**

## “МАРАЛЬНА ПАДРЫХТАВАНЫ ДА РОЗНЫХ СВІНСТВАЎ”

Свінні розныя бываюць. Бываюць брудныя, з-пад плоту, а бывае ружовенькая, засмажаная. Так што, гледзячы якую свінню мець на ўвазе. Я ўяўляю гэтую свінню ў 2007-м годзе ў выглядзе прыемнага, ружовага парсючка, якога не адразу хочацца закалоць. Ён голасна пракрычыць на ўвесь свет, што Беларусь жыве. Я спадзяюся, што год Свінні нам прынясе прыемнае свінства ў выглядзе мацавання нашай свінскай дзяржавы. Гэта я жартую. А тыя свінствы, якія неўзабаве нас могуць чакаць, паспрыяюць умацаванню нашага свінарніка. Я асабіста падрыхтаваны да розных свінстваў маральна. А вельмі вялікая частка нашага грамадства не падрыхтаваная. Свіння – яна вельмі родная нам і дарагая жывёліна. І мы з дзяцінства маем да яе добрыя адносіны. Таму ад свінні я чакаю толькі дабра.

**ІГАР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “МОГУЦЬ ПАЙСЦІ НА НАС СВІННЁЙ”

Могуць пайсці “свіннёй” расейцы. І наша абарона можа не вытрымаць іхнага націску. Бо гаворка пойдзе ўжо не пра цану на газ, а пра незалежнасць. Права застацца незалежнымі трэба даказаць. А беларусы – не прыбалты. Могуць, застаўшыся дзень без скваркі, такога наламаць, што дзецям і ўнукам расхлёбваць давядзецца. Страўнікам жа думаем, а не мазгамі і сэрцам.

**ЮРЫ ХАШЧАВАЦКІ, КІНАРЭЖЫСЁР:**

## “НЕ СТРАШНА, КАЛІ НЕ БУДЗЕ ГАЗА ЯЕ ПАДСМАЖЫЦЬ”

“Улічваючы тое, што папярэднія гады ўсе былі свінскія, я спадзяюся, што 2007-ы год проста пазбавіць беларусаў ад свінні. Гэта будзе самая цудоўная “свіння”, якую сёлетні год можа нам падкласці. І нават не страшна, калі ў нас не будзе газа, на якім мы зможам яе прыгатаваць. Мы дзеля такой нагоды вялікае вогнішча раскладзем.

**КРЫСЦІНА ВІТУШКА, СТВАРАЛЬНІЦА ІНТЭРНЭТ-САЙТА “НАШЫ ДЗЕТКІ”:**

## “СВІННЯ БУДЗЕ З БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛАЙ ПРАСЛОЙКАЙ”

Свіння будзе з бел-чырвона-белай праслойкай. Засмучацца далей ужо немагчыма. Павінен прачнуцца нейкі аптымізм. Тым больш, што колькасць натуральных беларусаў памнажаецца. Расце колькасць людзей, якім мова патрэбная ў розных сферах. Можа, не ў вышэйшых палітычных колах, можа, не ў сферах грамадскіх. Але ў побыце. А гэта важней. Што цікава, найбольшая цяга да мовы ў людзей з тэхнічнай адукацыяй, у праграмістаў, а не ў гуманітарыяў, якія звязаныя з мовай прафесійна. Для іх мова была пропускам на філфакі, дзе ніжэйшы конкурс, і яны ёю не карыстаюцца па-за працай. Яны людзі небагатыя, ім няма чым ганарыцца. А вось тэхнары ўжо могуць сабе дазволіць не толькі прыстойнае аўто, але і мову. Лекараў усё болей сустракаецца неабыякавых да мовы. Я тлумачу гэта тым, што людзі, якія вучыліся падчас беларусізацыі па нармальных падручніках, зараз сканчаюць інстытуты. Набылі стабільнасць у жыцці, пэўны статус сацыяльны. І вяртаюцца да мовы.

**ВАЛЕРЫ МАЗЫНСКІ, ТЭАТРАЛЬНЫ РЭЖЫСЁР:**

## “ХОПІЦЬ НАМ СПАДЗЯВАЦЦА НА СВІННЯЎ”

Не ведаю. Беларусі ўжо столькі свінняў падклалі, што яна павінна была б даўно зажыць няблага. Маючы столькі сала. Было б лепей, каб гэты год не свінню нам падклаў, а каб воўк здох дзе-небудзь у лесе. Таму што хопіць спадзявацца на свінняў. На саміх сябе пара спадзявацца. А інакш, так і будзем увесь час у свінячым стане хадзіць і верашчаць. Лепш, калі мы ператворымся ў лясных дзікоў. У лесе больш волі.

# НАВАГОДНЯЕ СТОЎПАТВАРЭННЕ

Святочны феерверк, арганізаваны ў сталіцы Беларусі каля будынка Нацыянальнай бібліятэкі ў ноч на Новы год, ледзве не скончыўся трагедыяй. Паглядзець на відовішча а палове на другую ночы сюды прыехалі каля 150 тысяч чалавек. Парадак ахоўвалі 400 спецназаўцаў і 500 курсантаў Акадэміі МУС. Адразу па заканчэнні феерверка агромністая маса людзей скіравалася ў метро. Паток быў настолькі шчыльны, што многія ўспомнілі аб трагедыі 1999-га году, калі ў падземным пераходзе метро "Няміга" загінулі больш за 50 чалавек. Сітуацыю гэтым разам уратавалі супрацоўнікі спецназа, якія аператыўна перакрылі ўваходы ў метро, а потым пачалі прапускаць людзей на станцыю "Усход" малымі партыямі.





www.naviny.by

На здымках: ***Феерверк** ля будынка Нацыянальнай бібліятэкі, Мінск, 1 студзеня 2007 году;* **Натоўп ля станцыі метро** *"Усход", Мінск, 1 студзеня 2007 году.*

# ІРЫНА КАЗУЛІНА ДАМАГАЕЦЦА ТЭРМІНОВАЙ ШПІТАЛІЗАЦЫІ МУЖА

Паводле Ірыны Казулінай, стан здароўя яе мужа не паляпшаецца. "3 студзеня мне з калоніі паведамілі, што ў Аляксандра павялічылася пухлівасць ног і рук. Я лічу, што яму патрэбная тэрміновая шпіталізацыя й буду прасіць пра гэта ў кіраўніцтва мінскага турэмнага шпіталя. Спадзяюся, што мне ўдасца й мужа ўгаварыць легчы ў шпіталь", – паведаміла Ірына Казуліна.

Аляксандр Казулін з 20 верасня па 11 снежня трымаў палітычную галадоўку пратэсту, за час якой схуднеў болей як на 25 кілаграмаў. Пасля выхаду з галадоўкі Казулін пачаў хутка набіраць вагу, пры гэтым медыкі адзначылі ў яго завышаную пухлівасць цела й патлумачылі гэта дрэннай працай нырак. Між тым ад шпіталізацыі палітык адмовіўся.

Нагадаем, былы кандыдат на прэзідэнта змешчаны ў калонію паводле абвінавачання ў хуліганстве ды арганізацыі вулічных беспарадкаў. Сваёй віны Аляксандр Казулін не прызнае й тлумачыць пераслед палітычнымі прычынамі.

**Паводле Радыё Свабода**

# «ЗРАБІ САБЕ ПЕЧКУ-БУРЖУЙКУ»

31 снежня на адной з цэнтральных вуліц Салігорска актывісты «Маладога Фронту» раздавалі мінакам улёткі, на якіх змяшчалася інструкцыя па вырабу «печак-буржуек» у хатніх умовах. Гэтаксама маладзёны прапанавалі бясплатныя дровы для самаробных буржуек. Акцыямі такога кшталту маладафронтаўцы нагадваюць пра сітуацыю вакол коштаў на газ і нафту.

**РС**

## Суседзі

# БЕЛАРУСКІ ЦУКАР НЕ ПУСКАЮЦЬ У РАСІЮ

***Пропуск беларускага цукру праз адзіны склад Маскоўскай мытні спынены 29 снежня, заявіў на пачатку новага году ў Мінску на прэс-канферэнцыі старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпром» Іван Данчанка.***

Як перадае інфармацыйнае агенцтва "Інтэрфакс", старшыня канцэрна лічыць, што расійскія мытныя службы «выконваюць чыйсьці заказ і дзейнічаюць на карысць невялікай групы бізнесоўцаў, якія жадаюць паставіць пад кантроль» увоз цукру з Беларусі.

Чыноўнік заўважыў, што зменшыліся нават тыя невялікія аб"ёмы пропуску цукру, якія назіраліся ў апошні месяц. Ён нагадаў, што летась мытнымі службамі Расіі быў распачаты шэраг захадаў, якія прывялі да рэзкага абмежавання паставак беларускай прадукцыі – «за 2006 год аб"ёмы рэалізацыі цукру знізіліся на 50%». Мытная служба абмежавала пропуск да 20 вагонаў у суткі, а з 1 лістапада 2006 году ў дачыненні беларускага цукру быў уведзены рэжым «профіль рызыкі», які ўжываецца «да самай жорсткай кантрабанды». У выніку праз мытны склад у суткі праходзіць усяго 5 вагонаў цукру, прычым ён увесь выгружаецца і правяраецца.

Паводле старшыні канцэрна, «беларускі бок, цукровыя заводы, Беларуская цукровая кампанія нясуць велізарныя страты". Ён адзначыў, што толькі ў выніку прастояў, выгрузкі і загрузкі вагонаў беларускі бок згубіў ужо каля 2 млн даляраў.

Як раней паведамлялася, Беларусь за апошнія тры месяцы змагла паставіць у Расію толькі 37 тысяч тон цукру.

**Паводле СМІ**

# САЛА, БУЛЬБА, ЛУКАШЭНКА

## ШТО ДУМАЮЦЬ АДЗІН ПРА АДНАГО БЕЛАРУСЫ, РУСКІЯ І ЎКРАІНЦЫ?



**Бульба і трактар** *«Беларус», Мінскі раён, фота з архіву.*

Да 15-й гадавіны Белавежскіх пагадненняў сацыёлагі правялі нямала апытанняў, спрабуючы высветліць, наколькі адрозніваюцца паводле сваіх уяўленняў і сістэмы каштоўнасцяў народы Беларусі, Расіі і Ўкраіны пасля таго, як кожная з іх набыла сваю дзяржаўнасць. У Лабараторыі этнічнай сацыялогіі і псіхалогіі Навукова-даследчага інстытута Санкт-Пецярбурскага дзяржаўнага ўніверсітэта было распрацаванае апытанне, заснаванае не метадзе свабодных асацыяцый, які прыдумаў псіхааналітык Зігмунд Фройд. Гэты прыём дазваляе даведацца, хто што думае на самой справе, бо цягам падобнага апытання меркаванні людзей меней кантралююцца свядомасцю.

Украіна выклікала ў расейцаў, на жаль, цалкам прадказальныя асацыяцыі. 27,3% апытаных пры слове «Украіна», без ваганняў выдалі: «Сала!». Далейшыя варыянты адказаў грамадзянаў Расіі, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце, размеркаваліся наступным чынам. 12,9% сказалі "Кіеў". 10,6%, пачуўшы "Украіна», казалі «хахлы» або, у некаторых выпадках, -- «хлопцы». Са словам "горілка" Украіна выклікае асацыяцы ў 8,6% апытаных расейцаў. Для 7,6% Украіна – гэта, перш-наперш, «суседзі». Слова «братэрства" і «браты» казалі 6,5%, «славяне» - 5,8%. Амаль 5% звязалі ў сваёй свядомасці Украіну з "аранжавай рэвалюцыяй". Яшчэ 4,4% пры слове «Украіна» згадалі ўкраінскага прэзідэнта Віктара Юшчанку. Для нязначнай групы жыхароў Расіі (крыху больш за 4 працэнты) Украіна – гэта «адпачынак, курорт».

Для саміх украінцаў Украіна – гэта «дом» і »радзіма" (48,6%). І толькі 9,5% украінскіх грамадзянаў, пачуўшы назву сваёй краіны, адразу ўспамінаюць пра "сала" і "горілку".

Для беларусаў, калі яны кажуць пра Украіну, сала, зразумела, таксама па-за канкурэнцыяй (34%), затое адразу за ім ідуць "мора" (18,5%) і "Крым" (15,6%). Менавіта ва Украіну беларусы часцей за ўсё ездзяць купацца і загараць.

Перш чым чытаць далей, запытайце ў саміх сябе, што ўяўляецца вам пры слове «Беларусь». Уявілі? Вы не адзіны. І для жыхароў Расіі (23,1%), і для украінцаў(23,5%), і для саміх беларусаў (39,1%) Беларусь сёння – гэта Лукашэнка. Адразу за ім і ў расейцаў (13,5%), і ва ўкраінцаў (16,1%), і ў беларусаў (23,1%) пры слове «Беларусь» ва ўяўленні ўсплывае бульба. Іншыя асацыяцыі блякнуць на фоне гэтых двух і адрозніваюцца ў розных народаў. Для грамадзянаў Расіі Беларусь – гэта яшчэ і Мінск (12,1%), браты (8,9%) і да таго ж яшчэ МАЗ, БелАЗ ды трактары (5,6%). Дарэчы, машыны і трактары пры згадванні Беларусі не ўспамінаюць ні беларусы, ні ўкраінцы.

Для ўкраінцаў, сярод якіх многія звязваюць сваю краіну з нестабільнасцю і беднасцю, Беларусь, акрамя Лукашэнкі і бульбы, азначае "стабільнасць, развітасць і багацце" (15,5%). Для 13% украінцаў Беларусь – гэта братэрства і дружба, а для 10,7% – суседзі.

Тыя беларусы, для якіх родная краіна, у першую чаргу, не Лукашэнка і бульба, а нешта іншае, пачуўшы «Беларусь», кажуць: «Радзіма» (23%) і »Мінск» (12,7%). Заўважна, што беларусы любяць і цэняць родную прыроду. Для 11,4% Беларусь – гэта азёры, а для 8,6% – лес.

Як ні дзіўна, не ўсе расейцы, калі ім гавораць "Расія", уяўляюць Уладзіміра Пуціна. Ледзьве не ў паловы апытаных першыя асацыяцыі з гэтым словам – "Радзіма" і "Айчына". У 12,1% Расія выклікае асацыяцыі з веліччу, магутнасцю, сілай. Трэцяе месца ва Уладзіміра Пуціна (амаль 11%). Следам за прэзідэнтам працягваюцца патрыятычныя асацыяцыі: прасторы, агромністая, вялікая (10,6%), маці, сям'я, дзяцінства (10,2%), Масква (8,6%), дом, мая (7,7%). Для ўкраінцаў жа Расія настолькі розная, што самая буйная група рэспандэнтаў склала ўсяго 18,4% ад агульнай колькасці апытаных. Для гэтай групы Расія – гэта, у першую чаргу, Масква, Красная плошча і маўзалей Леніна. Для 17,7% апытаных грамадзянаў Украіны Расія – гэта моц. А ў 16,9% Расія выклікае асацыяцыі з агрэсіяй, прыгнётам і захопам. Для 14,4% Расія – гэта прэзідэнт Пуцін. У даволі значнай групы ўкраінцаў (12,6%) Расія выклікае асацыяцыі з нафтай і газам.

Яшчэ больш беларусаў – 18 % – звязваюць з Расіяй газ і 16,6% – нафту. Цікава, колькі беларусаў назвалі б гэтыя ж словы, калі б апытанне праводзілася пад сёлетні Новы год? Пакуль што для іх, як і для ўкраінцаў, Расія – гэта, галоўным чынам, Масква (28,4%). У параўнанні з украінцамі, беларусы значна часцей звязваюць у свядомасці сваю краіну з прэзідэнтам. Таму пры слове Расія беларусы не радзей чым Маскву згадваюць Уладзіміра Пуціна (28,1%).

Для 16,8% беларусаў Расія – гэта нешта вялікае паводле памеру. Для 8,8% - Крэмль. Для 7,3% — гарэлка, для 6,4% -- Сібір, для 5,5% – "беспредел" (цікава, што ў беларускай мове вельмі цяжка знайсці эквівалент гэтаму слову), а для 5% — беднасць. Апошнія два словы у беларусаў увогуле ніколі не асацыююцца са словам Беларусь.

**Паводле www.tut.by**

# НЕПАД'ЁМНЫ ГАЗ

## ЦІ ДАВЯДЗЕЦЦА БЕЛАРУСАМ ІСЦІ Ў ЗЯМЛЯНКІ?

(Пачатак на стар.1)
шы і другую сусветную вайну, калі "беларусы і рускія разам гнілі ў акопах", і "чарнобыльцаў", у якіх расійскія алігархі збіраюцца забраць апошняе. Напрыканцы кіраўнік дзяржавы заявіў: "Аддайце ім ("Газпрому" – рэд.) 100 мільёнаў, нават 200 мільёнаў" – маўляў, хай падавяцца. А потым адмовіўся падпісваць кантракт з павялічанай цаной.

У выніку ў лютым 2004 годзе "Газпром" спыніў пастаўкі "блакітнага паліва" праз Беларусь. Рашучасці беларускіх уладаў тады хапіла літаральна на дзень, пасля чаго яны хуценька падпісалі дамову на умовах расійскага боку. І супакоіліся, бо нават новая цана была непараўнальна меншай за рынкавую.

Гэтую цану атрымлівалася захоўваць цягам амаль трох год. У 2006-м "Газпром", канечне, падвысіў бы кошт газу. Аднак напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі Крэмль загадаў не рабіць гэтага, каб падтрымаць Лукашэнку. Але ў сакавіку, як толькі выбарчая кампанія скончылася, расійскі канцэрн адразу паведаміў: на наступны год халявы не будзе. Беларускія ўлады гэта паведамленне фактычна праігнаравалі, заявіўшы ў адказ: паводле саюзных дамоўленасцяў, наша краіна мусіць атрымліваць газ па такой самай цане, што і Смаленская вобласць Расіі.

Таму, хоць гутарка пра новыя кошты вялася яшчэ ад канца сакавіка, перамовы, па сутнасці, пачаліся толькі ў апошні тыдзень снежня. Да гэтага бакі дэманстравалі рашучы намер стаяць на сваім і не пагаджацца ні на якія саступкі. Урэшце "Газпром" прапанаваў газ на 2007 год па 105 даляраў за тысячу кубамэтраў. Беларуская дэлегацыя згаджалася плаціць не болей за 75 даляраў.



Belzhaba.com

Аднак казыроў у афіцыйнага Мінска фактычна не было. Ён паспрабаваў блефаваць, закаціўшы чарговую істэрыку. 29 снежня Лукашэнка ў Жлобіне заявіў: "У зямлянкі пойдзем, але на газавы шантаж Расіі не паддамося". Тады ж ён упершыню звінавáціў у канфлікце не проста "пэўныя сілы" ў Расіі, а кіраўніцтва РФ.

Але й гэтыя гучныя заявы плёну не мелі. Крэмль наогул зрабіў выгляд, што не заўважыў словаў Лукашэнкі, а "Газпром" адказаў, што шантажом займаюцца менавіта беларускія ўлады.

Давялося, як і ў 2004 годзе, прымаць умовы "Газпрома".

На першы погляд, падсаладзіла горыч паразы палагоджаная цана на "Белтрансгаз". Пасля спрэчак, што доўжыліся некалькі гадоў, "Газпром" пагадзіўся, што гэтае прадпрыемства каштуе 5 мільярдаў даляраў (а не 500 мільёнаў, як расійскі канцэрн спрабаваў давесці напачатку). Дзякуючы жывым грашам, якія мяркуецца атрымаць за 50% акцыяў "Белтрансгаза", можна будзе змякчыць наступствы ад падвышэння цаны на газ у 2007-2010 гадах.

Але насамрэч не ўсе так проста. Бо грошы, атрыманыя за "Белтрансгаз", мяркуецца патраціць за чатыры гады, а часткай прыбытку гэтага прадпрыемства давядзецца дзяліцца з "Газпромам" усё астатняе жыццё. Таму ў рэальнасці расійскі канцэрн значную частку сваіх грошай верне, а Беларусь, наадварот, згубіць.

І наогул, калі ў нас такая паспяховая эканоміка, як пра гэта распавядае дзяржаўнае тэлебачанне і асабіста Аляксандр Лукашэнка, навошта прадаваць "фамільнае срэбра", каб разлічыцца за газ? Усе нашыя суседзі – і Польшча, і Літва, і Латвія, нават Украіна – плацяць значна больш за 100 даляраў, але па свеце з працягнутай рукой не пайшлі. І ў зямлянках нашыя суседзі жыць яўна не збіраюцца. Хаця, паводле сцвярджэнняў дзяржаўных прапагандыстаў, тамтэйшая эканоміка – гэта сапраўдная пустэча ў параўнанні з беларускім "аазісам". А тут раптам высвятляецца, што нават 100 даляраў – для нас цана "непад'ёмная". Пра гэта заявіў не нейкі апазіцыянер ці які-небудзь "незалежны аналітык", а прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, прычым ужо пасля падпісання кантракту. Дык чаму нашыя суседзі здольныя плаціць больш за нас? Можа, таму, што іхная эканамічная мадэль пераўзыходзіць лукашэнкаўскую?

Так ці інакш, улады РБ фактычна капітулявалі перад "Газпромам". А наступствы гэтага – як у эканоміцы, гэтак і ў палітыцы – мы неўзабаве адчуем.

**Валер Філін**

**Наша даведка**

*ДЫК КОЛЬКІ БУДЗЕМ ПЛАЦІЦЬ ЗА ГАЗ І ЦЯПЛО?*

*У адпаведнасці з двухбаковымі пагадненнямі, штогод цана на газ для Беларусі будзе расці, і да 2011 году яна дасягне еўрапейскага ўзроўню. Прыблізна да гэтага часу павінен завершыцца працэс акцыянавання "Белтрансгаза". Чакаецца, што да сярэдзіны 2010-га году «Газпром» атрымае 50% акцыяў беларускага прадпрыемства. Цягам 2007 – 2010-га гадоў "Газпром" будзе выплочваць Беларусі сваю долю роўнымі часткамі па 625 мільёнаў даляраў. (Агульны кошт "Белтрансгаза" ацэньваецца ў 5 мільярдаў даляраў.) Сёлета газ для спажыўцоў будзе каштаваць у 1,5 раза вышэй яго закупачнай цаны – 150 даляраў за тысячу кубаметраў. Паводле прагнозу беларускага ўрада, электраэнергія ў сувязі з гэтым падаражае на 54%, ацяпленне – на 55%.*

**КАЛІ Ў ВАС НЯМА ІНТЭРНЭТУ, А ВЫ ХОЧАЦЕ РЭГУЛЯРНА АТРЫМЛІВАЦЬ ПАПЯРОВУЮ ВЕРСІЮ "СВАБОДЫ" ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ВАШ АДРАС SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР:**
**+370 687 42 185**
**(КОШТ SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯ – 150 БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ).**
**ВАШ АДРАС БУДЗЕ ВЯДОМЫ ТОЛЬКІ РЭДАКЦЫІ І ТОЛЬКІ ДЛЯ ПАДПІСКІ**

# РАСІЙСКАЯ БЕЛАРУСЬ

Саюздрук

## АЛЬБО КАЗКІ АСТРОЛАГА-ПАЛІТІНФАРМАТАРА

Газета "Звязда" вырашыла напярэдадні Новага году парадаваць сваіх чытачоў лёгкай і дасціпнай гутаркай. На ролю каляднага дзядулі быў абраны Ул. Жырыноўскі. Вось такія атрымаліся жарты:

*"Я асабіста прыхільнік уваходжання Беларусі ў склад Расіі. І ўсё. Спыняцца адразу ўсе наскокі на Беларусь, яе эканоміка атрымае нармальныя цэны. Мы чапляемся за назвы — гэта наша бяда. За пасады чапляюцца, за флаг. І нічога не можам зрабіць. Якая розніца, які там флаг, як будзе называцца валюта. Нас аб'ядноўвае мова. Усім зразумела, што мы не можам перавесці Расію на беларускую мову з-за павагі да яе. Таму пераходзім на тую мову, якая зразумела для большасці, на тую валюту, якая мае значэнне. Рускі рубель — трэцяя валюта сёння ў свеце: долар, еўра і рубель. Юань ці іена? Яны як бы не каціруюцца, а рубель каціруецца.*

*Таму няхай агульнай валютай будзе рубель, мовай — руская, сталіцай — Масква. Нацыяналісты чапляюцца за мову і іншае для таго, каб эліта захавала свае прывілеі".*

Чым кіруецца Жырыноўскі, калі кажа, што беларусам не варта чапляцца за родную мову, я зразумець магу. А вось што рухае газетай, якая выходзіць пад дэвізам "Родная газета на роднай мове", калі яна друкуе гэткія інтэрв'ю, няясна. Дзеля каго і дзеля чаго? Каб напалохаць нас расійскім імперыялізмам? Ці падрыхтаваць маральна да ўваходжання ў склад Расіі?

А "Народная газета" ўзяла інтэрв'ю ва ўдзельнікаў з'езда прыўладнага Саюза Пісьменнікаў. Вось што сказаў паэт Віктар Шніп:

*"З якімі пачуццямі прымаю ўдзел у з'ездзе пісьменнікаў? Па-першае, мы даўно не бачыліся, не збіраліся ўсе разам, каб параіцца, падзяліцца творчымі планамі. Да таго ж, у з'ездзе прымуць удзел замежныя госці — літаратары з больш чым 30 краін свету. Усе мы, пісьменнікі, адчуваем адказнасць: трэба паказаць замежным калегам па пяру дасягненні сучаснай беларускай літаратуры, яе трывалы ўзровень. А нам, лічу, сапраўды ёсць што паказаць. Упэўнены, з'езд стане той кропкай, ад якой мы будзем ісці ў будучыню. Пачатак новага тысячагоддзя — час глядзець у будучае, якое ў нашай паэзіі, прозы, драматургіі ёсць, гэта не выклікае сумненняў".*

Цікава, з кім гэта так даўно не бачыўся спадар Шніп? Бо ўсе ягоныя калегі і прыяцелі ў новы саюз не перабягалі. Можа, ён хацеў пабачыцца з нейкім Андрэем Цяўлоўскім, які сказаў газеце наступнае:

*"З'езд пісьменнікаў дапаможа мне разабрацца, што сёння адбываецца ў нашай літаратуры, пачуць меркаванні аб гэтым іншых літаратараў — знакамітых, а таксама маладых, што, як і я, прыйшлі ў літаратуру нядаўна. Спадзяюся, будзе абмеркавана такое хвалюючае многіх, і мяне ў прыватнасці, пытанне: сёння вельмі мала мастацкай літаратуры выдаецца ў нашай краіне пры дзяржаўнай падтрымцы — за дзяржаўны кошт у сярэднім 5-7 выданняў у год. А вось на камерцыйнай аснове выдаецца вельмі шмат кніг, але ў асноўным невысокага ўзроўню. У выніку творы, што трапляюць да чытача, часта не праходзяць ніякага мастацкага адбору. Я лічу, што трэба падтрымліваць узровень твораў, якія выходзяць да чытача, інакш наша літаратура скоціцца да ўзроўню Марынінай і Данцовай".*

Той «мастацкі адбор», пра які кажа "малады пісьменнік", называецца цэнзурай. Чаму ўдзельнікі з'езда паводзяць сябе так сціпла? Чаму не расказваюць, што там у іх адбывалася, да чаго дамовіліся? А дамовіліся вось да чаго. Што трэба ўвесці ў школьную праграму па беларускай літаратуры творы Марчука і выкінуць з яе «Знак бяды» Быкава. Што варта заснаваць новы школьны курс пад назвай «беларуская рускамоўная літаратура» з Аўруціным і Чаргінцом у якасці класікаў. І што даўно пара забараніць прыватным выдавецтвам друкаваць мастацкую літаратуру. Вось толькі сумняюся я, што гэтую кампанію палохае Данцова з Марынінай.

"Советская Белоруссия" у апошнім нумары мінулага году надрукавала інтэрв'ю з галоўным "звездочетом" Расіі Паўлам Глобам. Той з упэўненасцю Заратустры прадказвае землятрусы, катастрофы і анамаліі. Але як толькі вялікі празорца даходзіць да лёсу нашай краіны, ён пераўтвараецца ў заштатнага палітінфарматара:

*«Беларусь, что бы про нее ни говорили, это европейское государство. И нынешнее правление Лукашенко – это подготовка к мощнейшему и техническому, и экономическому чуду Беларуси. Беларусь станет высокотехнологичной державой. И Лукашенко сейчас готовит для этого почву, потом его будут вспоминать добрым словом, даже несмотря на то, что сейчас некоторые называют его «диктатором». Когда у нас в 2012 году будет кризис, Беларусь, наоборот будет процветать. И я хочу сказать, что она всегда будет ориентирована на Россию, а не на Евросоюз, также как и Украина».*

Якая жахлівая будучыня ў нашай краіны! Але чамусьці мне больш верыцца ў сібірскія тропікі, чым ў расійскую Беларусь. Зрэшты, высокатэхналагічнай дзяржавай мы хутка пачнем станавіцца. Дзякуй за гэта Расіі.

**Алесь Канюціч**

# ЖУРНАЛІСТЫ АДПАЧЫВАЮЦЬ

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО ТОСТ ЗА КНОПКУ, ЯКОЙ МОЖНА ПЕРАКЛЮЧАЦЬ ХВАЛІ

Надышлі Каляды. Палітыкі ў сваіх віншаваннях да народа спаборнічаюць з самім Папам Рымскім, гаворачы правільныя і пабожныя словы. Журналістам тут рабіць няма чаго. Не будзеш жа задаваць правакацыйныя, крытычныя пытанні ў гэткі дзень. Адзінае, што можна было б завітаць на госці да іншых людзей, не палітыкаў. І адсвяткаваць разам з імі, і паслухаць іхнія галасы. Гаспадар на святы выстаўляе самыя лепшыя прысмакі. А нашы журналісты частавалі нас пераважна паўторамі. Хоць, здавалася, была магчымасць разгарнуцца і даць партрэты цікавых людзей.

Я Новы год сустракаў у кампаніі са сваім любімым радыёпрыймачом. І галоўны тост быў – за кнопку, якой можна пераключыць хвалю.

Да палітычных актуаліяў. Ідзе кампанія перад выбарамі ў мясцовыя саветы. Кандыдаты мелі выступы на дзяржаўных радыёстанцыях. На жаль, незалежныя каналы не прааналізавалі гэтую з'яву. Хацелася б пачуць гукавыя цытаты – пра што і як гаварылі афіцыйныя прадстаўнікі, пра што і як гаварыла апазіцыя. Можа, гэта яшчэ не позна зрабіць?

Моўная заўвага таксама калядная. Напярэдадні свята Віктар Чайкін на Еўрапейскім Радыё кажа: самы папулярны падарунак у Нямеччыне – шчаўкунок. Але ж мы арэхі не шчоўкаем, мы іх лушчым, расколваем, разбіваем. То, можа быць, гэты прадмет і славутага казачнага персанажа называць у нашай мове неяк па-іншаму: Лушчык альбо Раскол? **Сяржук Вітушка**

# МАСТАЦКІ СВЕРБ

Стрэмкі

## ЦІ НЕ ВАЖНЕЙ ХЛЕБ ДЫ ВОПРАТКА, ЧЫМ ЯКІСЬ ВЕРШЫК?

Нядаўна ў Вільні адбылася такая трагедыя: у адной з кавярняў разбушаваўся падпіты кліент. Давялося тэлефанаваць у паліцыю. Ну, а там, вядома, служаць асобы далёкія ад сентыментальнасці ды міласэрнасці. Глядзяць – нейкі брудны бомж? – ну й пачалі яго "вучыць" гумовымі дручкамі. А той назаўтра ўзяў ды памёр. І высветлілася, што быў адным з самых вядомых у Літве пісьменнікаў...

Прачытайце любую біяграфію паэта, мастака ці кампазітара – наўрад ці гэта будзе гісторыя шчаслівага жыцця. Нястачы, непрызнанне, голад... і толькі адзінкі чагось дасягаюць, і то атрымліваюць разам з лаўрамі "венец терновый".

І ўсё роўна – новыя й новыя асобы апантана пілуюць смычкамі, мажуць пэндзлямі, скрабуць асадкамі. І дзяцей сваіх цягнуць у хор, гвалтам садзяць да піяніна... Памятаю, прыйшоў да знаёмай, а яна таргуецца з малой дачкою – "Яшчэ пяць хвілін пайграй!" "Не-не-не, тры-ы-ы", – румзае "музыка".

А бывае – здаецца, ужо ўсяго дасягнуў чалавек, і багацця, і пашаны. Ды вось свярбіць яму нешта, і зачыняецца ён, і пачынае рыфмаваць: "людзі – грудзі", "нёс – прынёс". А потым нясе, шчаслівы, у выдавецтва, а адтуль, пакрыўджаны, у друкарню, выдаць за свой кошт...

Што ж, створаны быў чалавек паводле вобразу Бога – вось і хочацца яму хоць трохі адчуць сябе Творцам.

Памятаю, быў у мяне аднакласнік, вельмі практычны малады чалавек – дык ён усё абураўся, чаму гэта ўсе помнікі толькі паэтам ды пісьменнікам? А дзе помнік таму, хто вынайшаў плуг? Або ткацкі станок? Ці ж не важней хлеб ды вопратка, чым якісь вершык? І праўда – чаму?

Можа, таму, што іскрынка мастацкага таленту рэдка каму дастаецца? Але ж і гандлярскімі ці вынаходніцкімі талентамі таксама не кожны надзелены. Аднак любая маці дэманструе гасцям з гонарам тое сваё дзіця, якое склала вершык, а не тое, што купіла шакаладку за даляр, а прадало сябру за два... А дзіцячыя малюнкі... Хто з мастакоў не перажываў моманту, калі замілаваныя бацькі нясуць і нясуць госцю стосы "шэдэўраў" свайго нашчадка! І глядзіш, і хваліш, хваліш... крадком пазіраючы на гадзіннік.

А потым паглядзіш на тых, хто на вуліцы, шморгаючы носам і прытупваючы нагамі на марозе, дарэмна чакае пакупнікоў на свае "абразкі". Ці цяпер іхнія бацькі надта цешацца, што сынок малюе?

Як акрэсліць тую сумесь захаплення і – грэблівасці, з якой грамадства ставіцца да сваіх таленавітых суродзічаў? Яшчэ не так і даўно акцёраў – нават самых славутых – хавалі за могілкавай агароджай, разам з вісельнікамі і злачынцамі...

І трэба ж так – дапісваю гэты тэксцік, а праз вакно бачу – ідзе маленькі хлопчык і валачэ вялізны футарал з віяланчэллю...

Шчасця табе, чалавечак!

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ



**Шэсце Дзядоў** *Марозаў. Мінск, 30 снежня 2006 году.*

# Невядомая Беларусь

**4 студзеня** 1952 году нарадзіўся Юры Захаранка, генерал, былы міністр унутраных спраў Беларусі, адзін са зніклых без вестак апазіцыйных беларускіх палітыкаў.

**5 студзеня** 1938 году сакратар тройкі НКВД у Смаленску Антонаў падпісвае наступную паперку: "Гарэцкага Максіма Іванавіча – расстраляць. Ягоную асабістую маёмасць – канфіскаваць". Неўзабаве, праз пяць дзён, гэты прысуд класіку беларускай літаратуры будзе выкананы. Зразумець гэтага расстрэлу немагчыма. Затое не перастаеш здзіўляцца, як шмат зрабіў Максім Гарэцкі, не дажыўшы да сваіх сарака пяці гадоў.

**7 студзеня** ў 1910 годзе нарадзіўся Канстанцін Заслонаў – герой-партызан. Цікава, што родам Заслонаў з Расіі і ў Беларусь прыйшоў толькі ў верасні 1941 году, разам са сфармаваным у Маскве партызанскім атрадам. Крыху больш чым праз год Заслонаў загінуў у баі з гітлераўцамі. Яшчэ цікава, што ў кампартыю Заслонаў уступіў толькі незадоўга перад смерцю, у 1942 годзе.

**8 студзеня** 1919 году Мінск быў абвешчаны сталіцаю БССР. Дагэтуль павятовы і губернскі горад Мінск ніколі ў сваёй гісторыі не быў сталіцаю краіны.

**9 студзеня** 1848 году ў вёсцы Наднёман нарадзіўся Якуб Наркевіч-Ёдка. Ён скончыў Мінскую гімназію, вучыўся ў Маскве і Парыжы, а пасля вярнуўся дахаты. Наркевіч-Ёдка быў медыкам і прыродазнаўцам. У сваім маёнтку ён стварыў метэаралагічную станцыю, вывучаў атмасферную электрычнасць, хуткасць руху аблокаў, рабіў прылады для барацьбы з градам і для вымярэння вільготнасці глебы, а таксама для бяспроваднага прыёму электрамагнітных сігналаў. Наркевіч-Ёдка прыдумаў спосаб лячэння нервовых хваробаў электрычным масажам і нават адкрыў у сябе ў маёнтку санаторый.

Блакітны агеньчык

# ШЧАЎКУНЧЫК

## СТРАШНАЯ КАЗКА СА ШЧАСЛІВЫМ КАНЦОМ



Напярэдадні Новага году пранеслася чутка: ў ноч на 1-га студзеня будуць адлучаныя ўсе расійскія тэлеканалы! На фоне інфармацыйнай "газавай вайны", якая не жартам разгарэлася ў эфіры ў апошнія снежаньскія дні, тэлегледачы ў Мінску чуткам адразу паверылі. Афіцыйны прадстаўнік "Газпрома" Купрыянаў у нейкі момант пачаў нават у валёнках выступаць перад тэлекамерамі, каб пагрозы расійскага канцэрна наконт магчымага адключэння газа падаваліся беларускім гледачам яшчэ больш злавеснымі.

На спробы аптымістычных паведамленняў з беларускага боку, што пагадненне, маўляў, ужо зусім гатовае і вось-вось будзе падпісанае, расійскія газпромаўскія СМІ адказвалі пагрозлівымі абвяржэннямі – на ўзор колішняй савецкай дыпламатыі ў стылі Андрэя Грамыкі. (Міністра замежных спраў СССР Грамыку на Захадзе нават празвалі "містэрам Не".) Спроба арганізаваць "пісьмо акцыянераў Газпрома" з асуджэннем "палітыкі шантажу" з трэскам правалілася, паколькі арганізацыі, ад якой дзяржаўная агенцтва БелТА нібыта атрымала пісьмо, як хутка выявілася, не існуе ў прыродзе, і гэты факт з задавальненнем высмеялі расійскія медыі.

І – аніякай аналітыкі, аніводнай сур'ёзнай спробы з беларускіх тэлеэкранаў патлумачыць людзям, што адбываецца. Адзіным "прагнозам" сталі словы кіраўніка Беларусі ў рэпартажы з падземнага гандлёвага комплексу "Сталіца" (чаму, падумалася тады, менавіта падземнага?). У адказ на пытанне, якое хвалявала на той момант, бадай, усіх беларускіх пенсіянераў і хатніх гаспадыняў, ім было кінутае грэбліва-нервовае: "Ну, што вы так хвалюецеся пра той газ!" І сапраўды – чаго было хвалявацца, калі кіраўнік дзяржавы напярэдадні гуляў у хакей?

Ну, а потым было, як у казцы – за дзве хвіліны да бою крамлёўскіх курантаў высокія бакі (прэм'ер-міністра Беларусі прымусілі за такой справай ляцець у Маскву ў навагоднюю ноч!) падпісалі, усё-ткі, кантракт.

І ўсю ноч па ўсіх каналах грымела расійская папса: што на беларускіх тэлеканалах, што на расійскіх гучалі адны й тыя пошлыя жарты, амаль адныя й тыя настальгічныя савецкія песні. На якую халеру было іх адключаць, тыя расійскія каналы? Ніхто б і не заўважыў пераменаў. Бо раніцай 2007 году мы прачнуліся зусім не ў іншай краіне, а ў той самай, што і ўсе папярэднія – у постсавецкай.

Толькі з новым газам па новай цане.

**Максім Пешкаў**

МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ

**VILNIA.COM**

ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *"АРХІЎ"* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF;

ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ

**"СВАБОДА" БУДЗЕ ЗА НАМІ!**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў